# *§ 51–0. Навука, культура, адукацыя ў БССР у другой палове 1940-х — 1991 г.

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР БДУ
«ІДЗІ І ГЛЯДЗІ» «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ»
«Я З ВОГНЕННАЙ ВЁСКІ»
СТЭФАНІЯ СТАНЮТА
МІХАІЛ САВІЦКІ «ПЕСНЯРЫ»

**1. Развіццё культуры і мастацтва ў БССР у другой палове 1940-х — 1991 г.** У 1945–1980-х гг. развіццё выяўленчага мастацтва ў БССР было звязанае з глыбокім асэнсаваннем гістарычных падзей. Тэмай многіх мастацкіх твораў зрабіўся гераізм беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

На мяжы 1950–1960-х гг. у савецкім выяўленчым мастацтве пачынае фарміравацца кірунак, які атрымаў назву «суровы стыль». Асэнсаванне трагедыі Вялікай Айчыннай вайны, гераізацыя подзвігу і працоўных будняў, гісторыя Беларусі знайшлі адлюстраванне ў творах М. Савіцкага, В. Грамыкі,



*За родную Беларусь. Мастак У. Сухаверхаў. 1948 г.*



*Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе. Мастак Я. Зайцаў. 1950 г.*



*Мінск. 3 ліпеня 1944 г.*
*Мастак В. Волкаў. 1945–1955 гг.*



*Палонных вядуць.*
*Мастак А. Шыбнеў. 1946 г.*

Якія падзеі Вялікай Айчыннай вайны адлюстраваны на прадстаўленых палотнах?

Г. Вашчанкі, У. Стэльмашонка, А. Кашкурэвіча, Г. Паплаўскага. Беларускія мастакі працавалі ў станковым і манументальным жывапісе, у розных жанрах — сюжэтна-тэматычная карціна, партрэт, пейзаж, нацюрморт, графіка і інш.

**Архітэктура**

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе перад архітэктарамі стаяла задача аднаўлення разбураных гарадоў. У архітэктуры Беларусі канца 1940-х — пачатку 1950-х гг. дамінуючым стылем быў так званы «сталінскі ампір» (савецкі класіцызм) з яго манументальнасцю, услаўленнем гераічнага мінулага. У гэтым стылі забудаваная цэнтральная частка праспекта Незалежнасці ў г. Мінску.

У другой палове 1950-х — 1980-х гг. у БССР паўстаюць новыя гарады: Салігорск, Наваполацк, Светлагорск; узводзяцца новыя жылыя раёны ў Мінску: Зялёны Луг, Серабранка, Усход, Чыжоўка і інш. Будаўніцтва было звязана з імклівым ростам прамысловасці. Так, узнікненне г. Светлагорск абумоўлена будаўніцтвам Васілевіцкай дзяржаўнай раённай электрастанцыі. З распрацоўкай буйны́х радовішчаў калійных солей (Старобінскае і Любанскае) звязанае будаўніцтва г. Салігорск.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



*Міхаіл Андрэевіч Савіцкі (1922–2010)*



*«Праклён». З цыкла «Лічбы на сэрцы». 1979 г.*



*У залах мастацкай галерэі М. Савіцкага (г. Мінск)*

Цыкл карцін «Лічбы на сэрцы» М. Савіцкага зрабіўся найбольш вядомай серыяй карцін пра жахі нацысцкіх лагераў смерці. Жывапісец перанёс на палатно тое, праз што прайшоў сам у гады Вялікай Айчыннай вайны: нямецкі палон, лагер смерці.

У 1997 г. М. Савіцкі стаў першым кавалерам ордэна Францыска Скарыны. У 2006 г. мастак быў ушанаваны званнем «Герой Беларусі».

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, чаму цыкл карцін называецца «Лічбы на сэрцы».*
2. *На думку адных экспертаў, карціны цыкла «Лічбы на сэрцы» ўвасабляюць трагедыю і смерць людзей, на думку іншых — сілу духу і перамогу жыцця. Паглядзіце карціны гэтага цыкла ў інтэрнэце (мастацкай галерэі М. Савіцкага, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны). Што, на вашу думку, яны сімвалізуюць?*
3. *Якія яшчэ творы М. Савіцкі прысвяціў Вялікай Айчыннай вайне? Якія падзеі на іх адлюстраваныя?*

### Манументальнае мастацтва

1950–1970-я гг. зрабіліся часам росквіту савецкага і беларускага манументальнага мастацтва. Стварэнне мемарыялаў, прысвечаных подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, знайшло падтрымку на дзяржаўным узроўні. Адным з самых вядомых сімвалаў Мінска з'яўляецца Манумент Перамогі. Адкрыццё помніка адбылося ў 1954 г. Чатыры грані пастамента абеліска аформленыя бронзавымі гарэльефамі, якія стварылі беларускія скульптары.

Абеліск вянчае 3-метровы ордэн Перамогі. 4 бронзавыя вянкі вакол абеліска сімвалізуюць 4 франты,

байцы якіх удзельнічалі ў вызваленні рэспублікі ад нацысцкіх захопнікаў. 3 ліпеня 1961 г. каля манумента Перамогі быў запалены Вечны агонь, побач усталяваныя 12 гранітных блокаў з бронзавымі надпісамі-прысвячэннямі гарадам-героям.

### ГАРЭЛЬЕФЫ МАНУМЕНТА ПЕРАМОГІ, Г. МІНСК



*Партызаны Беларусі.*
*Скульптар А. Глебаў*



*Слава загінулым героям.*
*Скульптар З. Азгур*



*Савецкая Армія ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Скульптар С. Селіханаў*



*9 мая 1945 года.*
*Скульптар А. Бембель*

Сусветную вядомасць атрымаў мемарыяльны комплекс «Хатынь». Ён увекавечвае памяць пра жыхароў соцень беларускіх вёсак, спаленых нацыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мастацкай выразнасцю вылучаюцца мемарыяльныя комплексы «Брэсцкая крэпасць-герой» і «Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі».

**Тэатр**

У рэпертуары беларускіх тэатраў пераважалі тэмы Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі і быту краіны. Тэатры імкнуліся ўключыць у рэпертуар як класічныя творы, так і новыя пастаноўкі, якія адлюстроўвалі жыццё беларускага народа.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



*Мемарыяльны комплекс «Хатынь»*



*Мемарыяльны комплекс «Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі»*



*Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»*

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся прозвішчы архітэктараў і скульптараў, якія ўдзельнічалі ў стварэнні гэтых мемарыяльных комплексаў.*
2. *Як вы разумееце словы А. Р. Лукашэнкі: «Як толькі забудзем шлях да Хатыні, Сталінграда, Брэсцкай крэпасці, усё вернецца зноў, імгненна. Таму мы павінны трымацца за гэтую гістарычную памяць»?*
3. *Якія мемарыяльныя комплексы, на вашу думку, павінен наведаць кожны беларус? Чаму?*

Шырокую вядомасць атрымаў Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета. Вялікі ўнёсак у станаўленне і развіццё беларускага балета зрабіў балетмайстар В. Елізар’еў.

### Музыка

Былі створаныя новыя музычныя калектывы — Дзяржаўны народны хор пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча, Сімфанічны аркестр беларускага тэлебачання і радыё пад кіраўніцтвам Б. Райскага і інш. Далёка за межамі Беларусі сталі вядомыя сімфанічныя творы М. Аладава, Я. Цікоцкага, А. Багатырова.

Фарміраванню песеннага рэпертуару ў рэспубліцы паспрыяла творчасць вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры» пад кіраўніцтвам У. Мулявіна. Не менш вядомы ансамбль «Сябры» і яго мастацкі кіраўнік А. Ярмоленка. Творчасць гэтых ансамбляў вылучаюць меладычнасць, выкарыстанне народных інструментаў і шырокі рэпертуар песень на рускай і беларускай мовах. Да нашага часу ў беларусаў

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Тэма Вялікай Айчыннай вайны займала вялікае месца ў беларускай літаратуры другой паловы 1940-х — пачатку 1990-х гг. Многія беларускія пісьменнікі былі непасрэднымі ўдзельнікамі ваенных падзей: В. Быкаў, І. Мележ, І. Шамякін, І. Навуменка, А. Макаёнак, Я. Брыль. Ваеннымі карэспандэнтамі былі К. Крапіва, А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка.

*Успомніце літаратурныя творы гэтых аўтараў, вывучаныя на ўроках беларускай літаратуры. Якія падзеі Вялікай Айчыннай вайны знайшлі ў іх адлюстраванне? Як паказаны ў іх подзвіг і трагедыя беларускага народа ў гады вайны?*

папулярныя песні І. Лучанка і Э. Ханка («Жураўлі на Палессе ляцяць», «Мой родны кут», «Майский вальс», «Шуміце, бярозы», «Малиновка» і інш.).

**Кіно**

Да класікі савецкага кінематографа належаць фільмы, знятыя кінастудыяй «Беларусьфільм»: «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (рэжысёр М. Фігуроўскі), «Альпійская балада» (рэжысёр Б. Сцяпанаў), «Палеская хроніка» (рэжысёр В. Тураў). У фільмах В. Турава («Я родам з дзяцінства», «Сыны ідуць у бой») зняўся папулярны акцёр У. Высоцкі, які напісаў больш за 20 песень для беларускага кіно. Папулярнасць сярод дзяцей і моладзі ўсяго Савецкага Саюза атрымалі фільмы «Прыгоды Бураціна» (рэжысёр Л. Нячаеў), «Бронзавая птушка» (рэжысёр М. Калінін) і інш. Да нашага часу ўражвае гледачоў тонкім гумарам і багатай жыццёвай філасофіяй фільм «Белыя Росы» (яго паглядзела больш за 1 млн гледачоў, аўтар сцэнарыя — вядомы беларускі драматург А. Дудараў, рэжысёр І. Дабралюбаў).




*«Ідзі і глядзі». Рэжысёр Э. Клімаў*

На аснове дакументальнай трагедыі «Я з вогненнай вёскі», напісанай беларускімі пісьменнікамі А. Адамовічам, У. Калеснікам і Я. Брылём, зняты мастацкі фільм «Ідзі і глядзі» (рэжысёр Э. Клімаў). Гэтая карціна, на думку кінакрытыкаў, з'яўляецца адным з найлепшых фільмаў пра Вялікую Айчынную вайну.

Як вы лічыце, якое сэнсавае «пасланне» для сучасных людзей закладзена ў фільме «Ідзі і глядзі»?

**2. Дасягненні БССР у галіне навукі.** У 1944 г. аднавіла сваю дзейнасць Акадэмія навук БССР. Да пачатку 1950-х гг. была адноўлена штатная колькасць яе супрацоўнікаў. Значныя зрухі адбыліся ў развіцці прыродазнаўчых і тэхнічных навук. У 1950–1960-я гг. былі створаны інстытуты матэматыкі, фізікі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, тэхнічнай кібернетыкі, ядзернай энергетыкі і іншыя.




*АН БССР узнагароджана ордэнамі Дружбы народаў у 1975 г. і Леніна ў 1978 г.*

Вялікі ўнёсак у развіццё навукі зрабілі акадэмікі АН БССР:

*В. Купрэвіч*, доктар біялагічных навук; падчас кіравання Акадэміяй навук у 1952–1969 гг. прыклаў шмат намаганняў для аднаўлення даследаванняў у галіне генетыкі;

*П. Альсмік*, у 1951 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію за вывядзенне і ўкараненне ў вытворчасць высокапрадукцыйных сартоў бульбы;

*Г. Багамолаў*, у 1952 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію за разведку і адкрыццё Старобінскага радовішча калійных солей;

*М. Барысевіч*, доктар фізіка-матэматычных навук; кіраваў даследаваннямі ў галіне фізікі — спектраскапіі свабодных складаных малекул.

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Дасягненні беларускіх вучоных пасляваеннага перыяду выкарыстоўваліся не толькі ў Савецкім Саюзе, але і далёка за межамі СССР. Адно з найважнейшых дасягненняў АН БССР гэтага часу — цвёрдацельны лазер.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце прэзентацыю (паведамленне) аб дасягненнях беларускіх вучоных у пасляваенны перыяд, што атрымалі сусветнае прызнанне.*

Ператварэнне БССР у адзін з магутных індустрыяльных цэнтраў СССР з высокаразвітой машына-, аўтамабіле-, трактара- і прыборабудаўнічай, радыётэхнічнай і хімічнай прамысловасцю патрабавала

падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. У БССР вырасла колькасць ВНУ, яны рабіліся цэнтрамі развіцця фундаментальнай навукі. Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце пад кіраўніцтвам рэктара акадэміка А. Сеўчанкі фарміраваўся магутны кластар навукі і адукацыі прыродазнаўчанавуковага кірунку, шэраг навуковых школ гэтага профілю. Шырока за межамі Беларусі сталі вядомыя распрацоўкі беларускіх медыкаў. Так, загадчыца кафедры хвароб вачэй Мінскага медыцынскага інстытута Т. Бірыч прапанавала комплекснае лячэнне траўмаў вачэй у дзяцей і шэраг іншых навукова-практычных распрацовак.

У БССР імкліва развіваліся радыёэлектроніка і інтэгральная мікраэлектроніка, вылічальная тэхніка.

Ва ўмовах *навукова-тэхнічнай рэвалюцыі* пастаянна пашыраліся кірункі навуковых даследаванняў. Беларускія навукоўцы вывучалі пытанні развіцця энергетыкі, стварэння тэхнічных сродкаў для прадпрыемстваў машынабудаўнічай прамысловасці, распрацоўвалі радовішчы карысных выкапняў, выводзілі новыя сарты сельскагаспадарчых культур, вывучалі шляхі павышэння прадуктыўнасці жывёлы. Укараненне навуковых адкрыццяў у вытворчасць спрыяла павышэнню прадукцыйнасці працы, паляпшэнню ўмоў працы і якасці прадукцыі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У 1961 г. была выпушчана доследная партыя гадзіннікаў «Мінск» («Луч-1300»). За ўсю гісторыю свайго існавання прадпрыемства асвоіла больш за 1700 розных мадэляў.

1. *З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, якія віды гадзіннікаў выпускаў Мінскі гадзіннікавы завод «Луч».*
2. *Якія мадэлі гадзіннікаў былі адзначаны залатымі медалямі на міжнародных выставах?*



Пётр Клімук



Уладзімір Кавалёнак

Успомніце, чым значныя для СССР даты 4 кастрычніка 1957 г. і 12 красавіка 1961 г.

У 1948–1958 гг. была падрыхтаваная канцэпцыя гісторыі Беларускай ССР, рэалізаваная ў выглядзе двухтомнай «Гісторыі Беларускай ССР», першага абагульняльнага навуковага выдання айчыннай гісторыі. Працягваліся археалагічныя раскопкі старажытных гарадоў Беларусі. Ад сярэдзіны 1960-х гг. пачынаецца актыўны перыяд адраджэння сацыялагічнай навукі.

У 50–60-я гг. XX ст. беларускія вучоныя, у прыватнасці Інстытут фізікі АН БССР, удзельнічалі ў распрацоўцы і рэалізацыі розных касмічных праграм, стварэнні ракетна-касмічнай тэхнікі. У развіццё савецкай касманаўтыкі зрабілі дастойны ўнёсак беларускія лётчыкі-касманаўты Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак.

**3. Развіццё адукацыі ў БССР.** Пасля вызвалення БССР ад нацысцкіх захопнікаў адной з найважнейшых задач было аднаўленне школ. Для гэтага патрабавалася адрамантаваць або нанава ўзвесці будынкі, наладзіць выраб школьнага абсталявання, вучэбнай літаратуры, падрыхтаваць настаўнікаў. Рамонтам і будаўніцтвам школ займаліся не толькі будаўнікі, але і настаўнікі, бацькі вучняў і ваеннаслужачыя. Гэта дазволіла ўжо ў 1945/1946 вучэбным годзе ўвесці ў дзеянне 80 % ад даваеннай колькасці школ. У 1950/1951 вучэбным годзе ў БССР была адноўлена даваенная сетка агульнаадукацыйных школ.

Чаму ў пасляваеннай Беларусі аднаўленне школ было адной з найважнейшых задач?

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У 1958 г. Джон Кенедзі (будучы прэзідэнт ЗША), гаворачы пра «халодную вайну», сказаў: «Барацьба, у якой мы цяпер удзельнічаем, будзе выйграна або прайграна ў класах Амерыкі».

Далей ён прывёў прыклады адрозненняў у савецкай і амерыканскай сістэмах, падкрэсліўшы моцныя бакі савецкай адукацыі: «У каго сёння лепшая сістэма адукацыі — у ЗША або ў СССР? Чаму рускія цяпер выйграюць? <...> Амерыканскія школьнікі праходзяць 12-гадовае навучанне, тады як рускія школьнікі вучацца толькі 10 гадоў. Але за гэты час яны атрымліваюць больш гадзін навучання, чым амерыканскія за 12. Яны наведваюць заняткі шэсць дзён на тыдзень, дзесяць месяцаў на год. У іх на аднаго настаўніка прыблізна 17 вучняў, у нас 27. Апроч некаторага выбару ў вывучэнні замежных моў, яны не маюць факультатыўных прадметаў. 10-гадовы вучэбны план уключае ў абавязковым парадку пяць гадоў фізікі, пяць гадоў біялогіі, чатыры гады хіміі, адзін год астраноміі і дзесяць гадоў матэматыкі аж да трыганаметрыі і элементарнага матаналізу. Мала якія 12-гадовыя вучэбныя праграмы ў Амерыцы ахопліваюць столькі ж матэрыялу. <...> Рускія выпускаюць у дзесяць разоў больш інжынераў, чым некалькі дзесяцігоддзяў таму, і ў два з паловай разы больш, чым выпускаюць у ЗША. Яны вучаць і выпускаюць больш вучоных. Паводле некаторых ацэнак, цягам пяці гадоў у СССР будзе ў тры разы больш вучоных і інжынераў, чым у нас».

Дж. Кенедзі, 35-му прэзідэнту ЗША, прыпісваюць таксама словы: «СССР выйграў касмічную гонку за школьнай партай».

*1. У чым Дж. Кенедзі бачыў перавагі савецкай сістэмы адукацыі?*

*2. Як вы разумееце выразы: «выйграць касмічную гонку за школьнай партай», «прайграць вайну ў класах Амерыкі»? Пра што сведчаць гэтыя выразы?*

### Сярэдняя адукацыя

Развіццё адукацыі ў БССР у пасляваенны перыяд суправаджалася мноствам рэарганізацый, характэрных для ўсёй савецкай сістэмы адукацыі. Рэформы былі скіраваныя на павышэнне ўзроўню і якасці адукацыі. У 1949 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову «Аб усеагульным абавязковым сямігадовым навучанні». Да сярэдзіны 1950-х гг. пераход на ўсеагульнае сямігадовае навучанне быў у цэлым завершаны.

У 1958 г. была ўведзена абавязковая васьмігадовая адукацыя. Сярэднія 10-гадовыя школы былі

рэарганізаваныя ў агульнаадукацыйныя 11-гадовыя з вытворчым навучаннем. У школах вывучэнне асноў прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці суправаджалася абавязковай практыкай на мясцовых прадпрыемствах або ў калгасах. У 1964 г. сярэднія школы вярнуліся да 10-гадовага тэрміну навучання, а ў 1984 г. пачалася рэформа агульнаадукацыйнай школы, якая ўводзіла 11-гадовае навучанне з 6-гадовага ўзросту.

Ад 1977 г. усеагульнай і абавязковай была сярэдняя адукацыя. БССР ператварылася ў рэспубліку ўсеагульнай пісьменнасці. У 1978 г. права грамадзян на бясплатную адукацыю было замацаванае ў Канстытуцыі БССР.

**Прафесійна-тэхнічная адукацыя**

У БССР ствараліся ўмовы для адукацыі працоўнай моладзі, адкрываліся школы рабочай і сельскай моладзі. Былі створаныя прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, якія рыхтавалі кваліфікаваных рабочых для розных галін народнай гаспадаркі.

**Сярэдняя спецыяльная адукацыя**

Сетку сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пасля вайны давялося ствараць нанава. У 1960 г. у Беларусі было 102 сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, у якіх вучылася 62,2 тыс. навучэнцаў, а ў 1985 г. у сярэдніх спецыяльных навучальных установах па 260 прафесіях навучалася 160,4 тыс. чалавек.

**Вышэйшая адукацыя**

Была адноўлена сістэма вышэйшай адукацыі. Адкрываліся новыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, у іх ліку Мінскі радыётэхнічны інстытут, Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, Мінскі інстытут замежных моў, Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.

Патрэбы народнай гаспадаркі ў кадрах абумовілі адкрыццё шэрагу абласных профільных вышэйшых навучальных устаноў: Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута, Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту ў Гомелі, Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута, Віцебскага

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ




Цэнтрам універсітэцкай адукацыі з'яўляўся Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. За 1946–1958 гг. ён падрыхтаваў звыш 6,5 тыс. маладых спецыялістаў.



На васьмі факультэтах Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў 1958/1959 навучальным годзе навучаліся амаль 6 тыс. студэнтаў. За пасляваенныя гады акадэмія падрыхтавала 20 тыс. спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі.



Адным з найбуйнейшых тэхнічных ВНУ краіны стаў Беларускі політэхнічны інстытут. У 1958/1959 навучальным годзе ў ім рыхтавалі інжынераў па 24 спецыяльнасцях.

*1. Якіх спецыялістаў рыхтуюць дадзеныя ВНУ сёння?*
*2. Як змяніліся іх назвы?*

тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці, Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. Пачалі працаваць Брэсцкі, Мазырскі і Полацкі педагагічныя інстытуты. На базе Гомельскага педагагічнага інстытута быў створаны Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, на базе Гродзенскага педінстытута — Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт. Юнакі і дзяўчаты, якія працавалі на прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы, мелі магчымасць атрымліваць вышэйшую адукацыю завочна.

Ужо да 1961 г. у Беларусі на душу насельніцтва прыходзілася больш школ і ўніверсітэтаў, чым у такіх развітых краінах, як Вялікабрытанія, Францыя, Японія, Італія і ФРГ. На сярэдзіну 1980-х гг. у рэспубліцы працавала 33 ВНУ, у якіх навучалася 188,6 тыс. студэнтаў. Беларусь займала другое месца пасля РСФСР па колькасці студэнтаў на 1000 жыхароў, а якасць падрыхтоўкі ў ВНУ рэспублікі лічылася адной з найвышэйшых у Савецкім Саюзе.

*Для БССР была характэрная высокая ступень інтэграцыі ў агульную навукова-тэхнічную прастору СССР. Вучоныя БССР зрабілі значны ўнёсак у развіццё навукі. Навуковы патэнцыял рэспублікі паспяхова выкарыстоўваўся для ўдасканалення вытворчасці, павышэння сацыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця беларускага народа. Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі быў галоўным дасягненнем у развіцці народнай адукацыі. Вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы вялі падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі. У мастацтве вядучымі тэмамі былі подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, будаўніцтва сацыялізму.*

**калі ў свеце…**

1972 г. — стварэнне шведскага поп-гурта «АББА»

**у Беларусі…**

1969 г. — стварэнне вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры»

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Складзіце ментальную карту «Асноўныя тэндэнцыі развіцця культуры БССР у пасляваенны перыяд».
2. Дакажыце, што беларуская навука зрабіла значны ўнёсак у развіццё савецкай і сусветнай навукі.
3. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце характарыстыку сістэмы адукацыі ў БССР. Знайдзіце падабенствы і адрозненні сістэм адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і ў БССР.
4. Падрыхтуйце прэзентацыю «Тэма Вялікай Айчыннай вайны (працы, паўсядзённага жыцця) у карцінах беларускіх мастакоў другой паловы XX ст.».